СВЯТЛАНА ЦІХАНОЎСКАЯ
ОФІС

Аб'яднаны Пераходны Кабінет Беларусі
Прадстаўніцтва па нацыянальным адраджэнні

праект (лістапад 2023)

# ДАРОЖНАЯ МАПА

дэмакратызацыі вышэйшай адукацыі Беларусі на перыяд

50–100–500 дзён

## ПРЭАМБУЛА

1. Прадстаўлены праект Дарожнай мапы (далей ДМ) — вынік калектыўнай працы групы навуковых экспертаў і практыкаў у сферы вышэйшай адукацыі, якія былі вымушаныя праз сваю навуковую і грамадзянскую пазіцыю выехаць па-за межы Беларусі. Група была сфарміраваная па ініцыятыве Офіса Святланы Ціханоўскай і пры ўдзеле Аб'яднанага пераходнага кабінета ў сувязі з падрыхтоўкай дэмакратычнымі сіламі агульнай “Стратэгіі пераходу да Новай Беларусі”. Мяркуецца, што імплементацыя ДМ стане часткай рэалізацыі дадзенай Стратэгіі.

Пры падрыхтоўцы ДМ яе аўтары зыходзілі з таго, што Беларусь заслугоўвае сучасную дынамічную сістэму вышэйшай адукацыі. Гэтая сістэма будзе абапірацца на ўласны нацыянальны вопыт, дасягненні сусветнай навукі, адукацыі і культуры. Яна будзе адкрытай і канкурэнтнай у межах міжнароднага акадэмічнага супрацоўніцтва, карыстацца аўтарытэтам у беларускіх і замежных студэнтаў, выкладчыкаў і даследчыкаў. Фундаментальная прафесійная падрыхтоўка будзе спалучацца з фарміраваннем устойлівых грамадзянскіх якасцей, якія адпавядаюць выклікам часу. Усе грамадзяне будуць мець роўны доступ да атрымання вышэйшай адукацыі. Развіццё ўстаноў вышэйшай адукацыі будзе абапірацца на прынцып аўтаноміі, а якасць выкладання і навуковых даследаванняў — забяспечвацца конкурсным адборам кадраў і палітыкай інтэрнацыяналізацыі беларускай вышэйшай школы.

2. Мэта ДМ — забеспячэнне ўстойлівага функцыянавання і эфектыўнай дэмакратычнай трансфармацыі сістэмы вышэйшай адукацыі на працягу першых 50–100–500 дзён з моманту фарміравання Урада пераходнага перыяду[1].

Рэалізацыя пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне шэрага першачарговых задач:

– мінімізаваць уплыў негатыўных фактараў, выкліканых перш за ўсё спадчынай аўтарытарнага рэжыму, на функцыянаванне сістэмы вышэйшай адукацыі, забяспечыць устойлівасць навучальнага і навуковага працэсу;

– стымуляваць уцягнутасць супрацоўнікаў і студэнтаў у працэс дэмакратычнага кіравання беларускай акадэміяй, у тым ліку за кошт аднаўлення незаконна звольненых супрацоўнікаў і адлічаных студэнтаў[2];

– фарміраваць умовы для захавання і пашырэння існуючага матэрыяльна-тэхнічнага, фінансавага і кадравага патэнцыялу ўстаноў вышэйшай адукацыі (далей УВА);

– аднавіць і максімальна нарошчваць перарванае міжнароднае акадэмічнае супрацоўніцтва;

– забяспечыць шырокую грамадскую дыскусію і прафесійную экспертную падтрымку рэалізацыі сістэмнай рэформы вышэйшай адукацыі на кароткатэрміновую, сярэднетэрміновую і доўгатэрміновую перспектыву.

3. Пры падрыхтоўцы ДМ працоўная група зыходзіла з наступных базавых прыярытэтаў:

– прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, правоў чалавека, гуманістычнага характару адукацыі;

1 Паводле “Стратэгіі пераходу да Новай Беларусі”, пад пераходным перыядам разумецца прамежак часу, на працягу якога адбываецца пераход ад аўтарытарызму да дэмакратыі, г.зн. станаўленне дэмакратычных нормаў ажыццяўлення ўлады.

2 Аўтары ДМ падтрымліваюць падрыхтоўку акта аб люстрацыі на нацыянальным узроўні і лічаць неабходным уключыць у яго таксама сферу вышэйшай адукацыі. Мяркуецца, што для паспяховай дэмакратызацыі сістэмы ВА і развіцця акадэмічнай сферы ў Беларусі крытычна важна аднавіць аўтарытэт прафесіі выкладчыка.

- гарантыя канстытуцыйнага права на адукацыю, духоўнае, маральнае і фізічнае развіццё з улікам разнастайнасці асобых індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцей;
- інтэграцыя Беларусі ў сусветную акадэмічную прастору: пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва, забеспячэнне свабоднага ўдзелу беларускіх прадстаўнікоў у міжнародных акадэмічных абменах і праектах.

Трансфармацыя сферы вышэйшай адукацыі на працягу пераходнага перыяду будзе абапірацца, у першую чаргу, на наступныя прынцыпы:

- дэмакратызацыя: прадастаўленне неабходнай аўтаноміі акадэмічным інстытутам, забеспячэнне акадэмічных свабод і ўдзелу розных стэйкхолдараў у кіраванні УВА і сістэмай вышэйшай адукацыі ў цэлым;
- прыярытэт нацыянальных інтарэсаў і матывацыйная беларусізацыя: прасоўванне беларускай мовы і беларускай культуры праз спецыяльна распрацаваныя матывацыйныя меры;
- дэідэалагізацыя: устараненне крыніц і механізмаў разбуральнага ўплыву аўтарытарнай і антынацыянальнай (імперскай, бальшавіцкай, савецкай) ідэалогіі, вызваленне УВА ад выкананне прапагандысцкіх функцый.

4. ДМ — гэта пералік паслядоўных, звязаных паміж сабой дзеянняў (мерапрыемстваў), якія, на думку аўтараў, могуць быць рэалізаваныя цалкам або часткова ў рамках канструктыўнага ўзаемадзеяння будучага дэмакратычнага Урада пераходнага перыяду[3] і структур грамадзянскай супольнасці Беларусі. Прапанаваныя мерапрыемствы ў сваёй сукупнасці закліканыя стаць адным са складнікаў комплекснага плана выканаўчай улады Беларусі, кіраўнікоў УВА па пераўтварэнні аўтарытарнай дзяржавы ў дэмакратычную. Задача ДМ — не толькі садзейнічаць захаванню

3 Згодна са “Стратэгіяй пераходу да Новай Беларусі”, у перыяд транзіту ўлады будзе сфарміраваны Урад пераходнага перыяду, які забяспечыць стабільнасць функцыянавання дзяржаўных органаў кіравання і бесперапыннасць аказання дзяржаўных паслуг.

ўстойлівасці функцыянавання беларускіх акадэмічных супольнасцей на працягу ўсяго пераходнага перыяду, але і забяспечыць хуткі і паспяховы старт рэфармавання ўсёй сістэмы адукацыі.

5. Дзеянне ДМ разлічана на першыя пяцьсот дзён пераходнага перыяду. Пры яе распрацоўцы ўлічвалася тое, што ў самым пачатку пераходнага перыяду спатрэбіцца прыпыненне шэрага прававых нормаў існуючага на той момант ранейшага заканадаўства, якія ствараюць перашкоды для дэмакратычных пераўтварэнняў[4].

На думку аўтараў ДМ, распрацоўка праектаў асноўных канцэптуальных дакументаў будучай рэформы вышэйшай адукацыі павінна пачынацца ўжо на цяперашнім этапе і актыўна працягвацца ў пераходны перыяд. Дакументы, якія былі падрыхтаваныя экспертамі сумесна са структурамі грамадзянскай супольнасці на падставе нацыянальнага і міжнароднага вопыту і прайшлі навуковую і грамадскую экспертызу, будуць перададзеныя органам будучай заканадаўчай улады Беларусі. Толькі будучы дэмакратычна абраны заканадаўчы орган краіны будзе мець права вызначаць прыярытэты развіцця беларускай вышэйшай адукацыі, тэмпы і кірункі рэфармавання яе інстытутаў, дзяржаўныя абавязацельствы і камерцыйныя ўмовы ў гэтай сферы.

6. Частка рашэнняў і дзеянняў, уключаных у ДМ, закранаюць выключна сферу вышэйшай адукацыі, іншыя ж могуць ажыццяўляцца толькі ў шчыльнай сувязі з усімі іншымі ўзроўнямі сістэмы адукацыі і нават у маштабах агульнай палітыкі новых беларускіх уладаў. Такі падыход патрабуе гнуткага ўзгаднення і сінхранізацыі прадстаўленага праекта з іншымі агульнанацыянальнымі і галіновымі канцэптуальнымі дакументамі, перш за ўсё ў плане выкарыстанай тэрміналогіі, стварэння ў краіне сістэмы дзяржаўных і грамадскіх часовых і пастаянных кіраўнічых, каардынацыйных

4 Згодна са “Стратэгіяй пераходу да Новай Беларусі”, для захавання прававой пэўнасці законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты, якія дзейнічаюць на пачатак пераходнага перыяду, будуць дзейнымі ў той меры, наколькі яны не супярэчаць правам і свабодам грамадзян, а пасля прыняцця новай Канстытуцыі — наколькі яны не супярэчаць наноў прынятай Канстытуцыі.

і кансультатыўных структур, паслядоўнасці і фінансавання запланаваных мерапрыемстваў і г.д.

7. Поруч з урадам найважнейшым суб’ектам рэалізацыі ДМ з’яўляюцца структуры грамадзянскай супольнасці Беларусі, без актыўнага ўдзелу і падтрымкі якіх немагчымае не толькі выкананне прапанаваных мерапрыемстваў, але і ажыццяўленне дэмакратычнай палітыкі ў цэлым. Аўтары ДМ бачаць значную ролю студэнцтва і моладзі ў ажыццяўленні дэмакратычных пераўтварэнняў у сістэме вышэйшай адукацыі. Існуе цвёрдая ўпэўненасць, што студэнцтва свабоднай Беларусі праявіць ініцыятыву і возьме самы актыўны ўдзел у ажыццяўленні дэмакратычных пераўтварэнняў у сістэме вышэйшай адукацыі. Ніякія сходы, акцыі і працэсы стварэння моладзевых арганізацый не могуць быць навязаныя зверху. Стварэнне і дзейнасць прафсаюзаў таксама з’яўляецца выключна ініцыятывай супрацоўнікаў УВА.

Супрацоўнікі і студэнты УВА, абноўленыя прафсаюзныя і студэнцкія арганізацыі, новыя дэмакратычныя кіраўнікі ўніверсітэтаў і іх нацыянальныя фарміраванні (Рада рэктараў Беларусі і іншыя) — значныя суб’екты рэалізацыі мерапрыемстваў ДМ.

8. Відавочна, што рэалізацыя ДМ будзе пачынацца ў неспрыяльных умовах. Дзейная ў цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь сістэма адукацыі не адпавядае сучасным патрабаванням ні ў плане існуючай мадэлі кіравання і прыняцця рашэнняў, ні ў плане зместу адукацыі, ні ў плане адукацыйных тэхналогій і методык. Дэградацыя сістэмы вышэйшай адукацыі праяўляецца ў рэзкім скарачэнні міжнароднага акадэмічнага супрацоўніцтва, заўважным пагаршэнні матэрыяльнага і фінансавага стану УВА, зніжэнні прафесійнага ўзроўню прафесарска-выкладчыцкага складу і кіраўнічых кадраў, паскарэнні працэсаў бюракратызацыі, павелічэнні колькасці неўласцівых для акадэмічнай сферы функцый і г.д.

У сістэме вышэйшай адукацыі назапасілася крытычная маса праблем, якія на фоне бязвольнасці і злачынных паводзінаў яе кіраўнікоў, палітычнага і эканамічнага крызісаў працягваюць

пагаршацца[5]. Варта падкрэсліць, што пералічаныя, а таксама многія іншыя сур'ёзныя праблемы старанна хаваюцца ад шырокай грамадскасці з дапамогай маніпуляцыі інфармацыяй і выбарачнай статыстыкі, аднабаковага асвятлення падзей і г.д.

9. Рэалізацыя ДМ уключае ў сябе тры этапы:

- **50 дзён**: стартуе з моманту фарміравання Урада пераходнага перыяду. Асноўная задача – захаванне ўстойлівага функцыянавання сістэмы вышэйшай адукацыі за кошт ажыццяўлення неадкладных арганізацыйна-кадравых змен ва УВА, найперш у сістэме кіравання;
- **100 дзён**: асноўная задача — пераход УВА да дэмакратычнага кіравання пры падтрымцы абноўленых прафсаюзных і студэнцкіх арганізацый. Шырокае грамадскае і экспертнае абмеркаванне канцэптуальных дакументаў па развіцці дэмакратычнага кіравання (Прыкладны Статут УВА[6] і інш.);
- **500 дзён**: асноўная задача — правядзенне дэмакратычных выбараў органаў самакіравання УВА. Шырокае грамадскае і экспертнае абмеркаванне напрамкаў будучай рэформы сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі.

5 Гл. дакумент "Аналіз бягучай сітуацыі ў сістэме вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь". https://asvetaby.org/wp-content/uploads/2023/12/annex_dk_by.pdf

6 Прыкладны Статут УВА — гэта дакумент, які вызначае базавыя прынцыпы і рамкавыя ўмовы, што забяспечваюць дэмакратычнае функцыянаванне УВА. На падставе Прыкладнага Статута навучальныя ўстановы распрацоўваюць уласныя статуты, у якіх рэгулююць асноўныя напрамкі дзейнасці, фарміраванне сістэмы кіравання, узаемаадносіны супрацоўнікаў і навучэнцаў.

# 50 ДЗЁН

| № | Назва мерапрыемства | Адказныя | Перыяд рэалізацыі | Каментарыі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Прызначэнне міністра адукацыі | Урад пераходнага перыяду (далей УПП) | 1–3 дзень | |
| 2 | Прыняцце пераходным урадам нарматыўнага прававога акта аб увядзенні дадатковага кантролю над буйнымі банкаўскімі аперацыямі з мэтай прадухілення крадзяжу і нямэтавага выкарыстання фінансавых сродкаў арганізацый сістэмы ВА | УПП | 1–3 дзень | Устанаўленне часовага кантролю над банкаўскімі аперацыямі прадугледжваецца на перыяд да завяршэння фінансавага аўдыту. У далейшым будуць вызначаныя пастаянныя формы фінансавага кантролю |
| 3 | Стварэнне пры Міністэрстве адукацыі Нацыянальнай рады вышэйшай школы (НРВШ), закліканай:<br>- забяспечыць узаемадзеянне грамадзянскай супольнасці і дзяржаўных органаў у сферы адукацыі;<br>- каардынаваць працу па выкананні ДМ;<br>- аказваць інфармацыйную і кансультатыўную падтрымку міністэрству, установам ВА, іншым зацікаўленым структурам па пытаннях дэмакратычнай трансфармацыі сістэмы вышэйшай адукацыі | Міністр адукацыі | 1–2 тыдні | Рада фарміруецца на аснове дэлегавання прадстаўнікоў структур грамадзянскай супольнасці, якія дзейнічаюць у сферы адукацыі, навукі і культуры, а таксама персанальнага запрашэння аўтарытэтных экспертаў у сферы адукацыі, палітыкі, эканомікі і права |
| 4 | Прыняцце пераходным урадам нарматыўнага прававога акта аб спыненні дзейнасці ва УВА структур БРСМ і “Белая Русь” | УПП, НРВШ | 1–2 тыдні | |
| 5 | Унясенне змен, неабходных для рэалізацыі ДМ, у Кодэкс аб адукацыі і іншыя нарматыўныя прававыя акты | УПП, НРВШ | 2–3 тыдні | За выключэннем асобных палажэнняў, Кодэкс аб адукацыі захоўвае сілу на пераходны перыяд. Далейшы лёс Кодэкса будзе вырашацца ў ходзе рэформы ВА.<br>У прыватнасці, мяркуецца стварэнне прававой асновы для правядзення выбараў рэктараў на этапе “500 дзён”.<br>Рэкамендуецца падрыхтаваць праект неадкладных змен у заканадаўства да пачатку пераходнага перыяду |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6 | Прызначэнне пераходным урадам рэктараў УВА і кіраўнікоў іншых арганізацый сістэмы ВА | УПП | 1–2 тыдні | Прызначэнне павінна адбыцца ў максімальна кароткія тэрміны, каб захаваць кіравальнасць і ўстойлівасць сістэмы вышэйшай адукацыі.<br>У далейшым прадугледжваецца працэдура абрання рэктараў на падставе новага заканадаўства |
| 7 | Фарміраванне на нацыянальным узроўні Канферэнцыі рэктараў як дарадча-кансультатыўнага органа ўніверсітэцкіх аўтаномій | | 3–4 тыдні | Рэкамендуецца падрыхтаваць праект Палажэння аб Канферэнцыі рэктараў да пачатку пераходнага перыяду |
| 8 | Правядзенне незалежнага фінансавага аўдыту УВА | Рэктары УВА | 1–7 тыдні | Пра вынікі аўдыту інфармуюцца працоўныя калектывы, а таксама ўсе зацікаўленыя структуры |
| 9 | Прыняцце пераходным урадам нарматыўнага прававога акта аб рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій, які рэгулюе ў тым ліку:<br>- працэдуру і тэрміны аднаўлення на працы ва УВА супрацоўнікаў, незаконна звольненых праз сваю грамадзянскую і навуковую пазіцыі, а таксама крыніцы і памер выплат устаноўленай ім кампенсацыі;<br>- працэдуру і тэрміны аднаўлення студэнтаў, адлічаных праз сваю грамадзянскую пазіцыю, а таксама крыніцы і памер выплаты незаконна адлічаным устаноўленай кампенсацыі | УПП, НРВШ | 1–2 тыдні | Прадугледжваецца максімальна хуткае аднаўленне рэпрэсаваных. Для гэтага актам павінен быць прадугледжаны актыўны ўдзел у працэсе аднаўлення ва УВА працоўных калектываў (напрыклад, праз стварэнне спецыяльных камісій) |
| 10 | Фарміраванне ва УВА грамадскіх камісій па развіцці (ГКР) УВА з ліку аўтарытэтных выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў. ГКР закліканыя ажыццяўляць узаемадзеянне паміж працоўным калектывам і адміністрацыяй, аказваць падтрымку кіраўніцтву УВА і адпаведных падраздзяленняў (факультэтаў і г.д.) па дэмакратычнай трансфармацыі сістэмы кіравання і выкананні мерапрыемстваў ДМ | Рэктар, працоўныя калектывы | 2–3 тыдні | Камісіі фарміруюцца на падставе ініцыятыў супрацоўнікаў і студэнтаў пры падтрымцы рэктара. Камісіі закліканыя выконваць функцыі драйвера перамен і садзейнічаць дэмакратызацыі акадэмічнай супольнасці |
| 11 | Прыняцце НРВШ сумесна з ГКР УВА рэкамендацый аб выключэнні з вучэбных праграм прапагандысцкага кантэнту аўтарытарнай і антыбеларускай накіраванасці, а таксама ацэначных і факталагічных скажэнняў у выкладанні гістарычных і грамадска-палітычных тэм | Міністр адукацыі, НРВШ, ГКР УВА | 3–5 тыдні | У дакуменце выкладаецца працэдура экспертызы вучэбных праграм і прыняцця адпаведных рашэнняў. Прадугледжваецца стварэнне спецыяльных прадметных камісій ва УВА для ацэнкі вучэбных праграм.<br>У дадзены перыяд задачай з'яўляецца не распрацоўка новых праграм, а толькі выключэнне з адпаведных праграм аўтарытарнага кантэнту. У асобных выпадках можа спатрэбіцца перапрацоўка вучэбных праграм і/або вучэбных планаў з адпаведным зьмяненнем аб'ёму акадэмічных гадзін |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 12 | Вынясенне на грамадскае абмеркаванне праекта Прыкладнага Статута УВА Беларусі, а таксама Рэкамендацый па ўвядзенні Статута УВА (асноўныя этапы і тэрміны) | НРВШ, Канферэнцыя рэктараў, ГКР | 4–5 тыдні | Рэкамендуецца падрыхтаваць праект Прыкладнага Статута да пачатку пераходнага перыяду.<br>У дакуменце прапануецца прыкладная дэмакратычная структура кіравання УВА, вызначаюцца паўнамоцтвы і кампетэнцыя органаў, якія ствараюцца, а таксама механізм іх фарміравання.<br>Прапанаваныя ў дакуменце стандарты і тэрміналогія носяць рэкамендацыйны характар для выкарыстання на ўзроўні УВА |
| 13 | Маніторынг грамадскай думкі супрацоўнікаў і студэнтаў УВА адносна рэалізацыі мерапрыемстваў ДМ і бягучых трансфармацый ва УВА, аптымізацыя сістэмы камунікацыі ўнутры УВА, пастаяннае ўзаемадзеянне з прафесарска-выкладчыцкім складам, супрацоўнікамі і навучэнцамі УВА па пытаннях рэалізацыі ДМ | Кіраўніцтва УВА, ГКР | З 2–3-га тыдняў цягам усёй рэалізацыі ДМ | Стварэнне каналаў камунікацыі ўнутры УВА, у тым ліку каналаў зваротнай сувязі. Пастаяннае ўзаемадзеянне па гэтых каналах з усімі мэтавымі грамадскімі групамі: ПВС, студэнтамі, іншымі супрацоўнікамі УВА — на базе HR-дэпартаментаў і прэс-службаў УВА |
| 14 | Стварэнне сістэмы рэгулярнай камунікацыі са знешнімі стэйкхолдарамі (партнёрамі, СМІ, шырокай грамадскасцю) па пытаннях рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі | Кіраўніцтва УВА, ГКР | З 2–3-га тыдняў цягам усёй рэалізацыі ДМ | Стварэнне на базе прэс-службаў і медыяцэнтраў УВА адпаведных дыскусійных пляцовак на афіцыйных сайтах УВА і міністэрства, у сацыяльных сетках, СМІ і г.д. Правядзенне брыфінгаў прадстаўнікоў НРВШ і ГКР, публікацыя рэгулярных справаздач аб працы НРВШ па выкананні ДМ |
| 15 | Падрыхтоўка і прадстаўленне шырокай грамадскасці Нацыянальнага даклада аб вышэйшай адукацыі (уключаючы аналіз інфраструктуры, сістэмы кіравання, наяўных рэсурсаў і кадравага забеспячэння) для больш граматнага планавання далейшых дзеянняў | Міністэрства адукацыі, НРВШ | 6–7 тыдні | Мяркуецца ўкараненне ў практыку падрыхтоўкі штогадовага прадстаўлення нацыянальных дакладаў аб адукацыі |
| 16 | Публікацыя НРВШ сумесна з ГКР УВА прамежкавага даклада аб выніках выканання ДМ — 50 дзён.<br>Правядзенне аб'яднанай прэс-канферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў міністэрства і прадстаўнікоў НРВШ для СМІ і НДА па пытанні рэалізацыі мерапрыемстваў першага этапу ДМ.<br>На падставе праведзенага аналізу і перагляду рызык унясенне змяненняў і дапаўненняў у ДМ на наступныя этапы | Міністэрства, НРВШ, ГКР | 7–8 тыдні | |

# 100 ДЗЁН

| № | Назва мерапрыемства | Адказныя | Перыяд рэалізацыі | Каментарыі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Арганізацыя шырокага абмеркавання праекта Прыкладнага Статута УВА з удзелам усіх зацікаўленых бакоў | НРВШ, Канферэнцыя рэктараў, кіраўніцтва УВА, ГКР | 8–40 тыдні | Стварэнне спецыяльнай рубрыкі на афіцыйных сайтах УВА і міністэрства, у іх акаўнтах у сацыяльных сетках, прыцягненне да ўдзелу СМІ. Абмеркаванне на сходах супрацоўнікаў, улік прапаноў стэйкхолдараў |
| 2 | Фарміраванне экспертнай групы з удзелам аўтарытэтных даследчыкаў і практыкаў, прадстаўнікоў НДА, супрацоўнікаў зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў для правядзення аналізу канцэптуальных праектаў рэформы вышэйшай адукацыі, якія распрацоўваюцца ў Беларусі. Падрыхтоўка на іх падставе аналітычнай справаздачы, у якой будуць акрэслены агульныя падыходы і прынцыповыя разыходжанні, а таксама сфармуляваныя адпаведныя рэкамендацыі | НРВШ, міністр адукацыі | 8–60 тыдні | Розныя актары могуць рыхтаваць і прапаноўваць для абмеркавання праекты рэформы.<br><br>Экспертная група адкрытая для прадстаўнікоў усіх камандаў, якія падрыхтавалі абгрунтаваныя праекты.<br><br>Мяркуецца прыцягненне да працы экспертнай групы міжнародных экспертаў |
| 3 | Садзейнічанне ў арганізацыі шырокага грамадскага абмеркавання асноўных напрамкаў, прыярытэтаў і канцэпцый рэформы сістэмы вышэйшай адукацыі ва ўзаемадзеянні са знешнімі стэйкхолдарамі (партнёрамі, СМІ, шырокай грамадскасцю) | Кіраўніцтва УВА, ГКР, НРВШ | 8–72 тыдні | Стварэнне на базе прэс-службаў і медыяцэнтраў УВА адпаведных дыскусійных пляцовак на афіцыйных сайтах УВА і міністэрства, у сацыяльных сетках, СМІ і г.д. |
| 4 | Абмеркаванне са знешнімі і ўнутранымі стэйкхолдарамі на спецыяльна створаных дыскусійных пляцоўках асноўных формаў і зместу рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі, прадстаўленне вынікаў абмеркавання экспертамі | Міністр адукацыі, НРВШ | 8–72 тыдні | На адпаведных дыскусійных пляцоўках на афіцыйных сайтах УВА і міністэрства, у сацыяльных медыя, сродках масавай інфармацыі, а таксама на сходах супрацоўнікаў |
| 5 | Арганізацыя навучання супрацоўнікаў сістэмы адукацыі дэмакратычным працэдурам, механізмам і прынцыпам дзейнасці і ўзаемадзеяння ва ўмовах акадэмічнай свабоды вышэйшай адукацыі (з выкарыстаннем вопыту замежных універсітэтаў) | НРВШ, кіраўніцтва УВА | 8–72 тыдні | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6 | Аднаўленне і развіццё міжнароднага супрацоўніцтва.<br>Пашырэнне акадэмічнай мабільнасці | Міністэрства адукацыі, НРВШ, кіраўніцтва УВА | 8–72 тыдні | Вяртанне Беларусі ў Балонскі працэс.<br>Заключэнне дагавораў аб супрацоўніцтве з замежнымі акадэмічнымі інстытуцыямі |
| 7 | Публікацыя НРВШ сумесна з ГКР УВА прамежкавага даклада аб выніках выканання ДМ — 100 дзён. Правядзенне аб’яднанай прэс-канферэнцыі з удзелам прадстаўнікоў міністэрства і прадстаўнікоў НРВШ для СМІ і НДА па пытанні рэалізацыі мерапрыемстваў ДМ — 100 дзён. Унясенне змяненняў і дапаўненняў у ДМ на наступныя этапы на падставе праведзенага аналізу і перагляду рызык | Міністэрства, НРВШ, ГКР | 13–14 тыдні | |

# 500 ДЗЁН

| № | Назва мерапрыемства | Адказныя | Перыяд рэалізацыі | Каментарыі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Заканчэнне абмеркавання праекта Прыкладнага Статута УВА на розных узроўнях з удзелам усіх зацікаўленых бакоў | НРВШ, Канферэнцыя рэктараў, кіраўніцтва УВА, ГКР | 15–40 тыдні | З дапамогай спецыяльных рубрык на афіцыйных сайтах УВА і міністэрства, у іх акаўнтах у сацыяльных сетках, прыцягненне да ўдзелу СМІ. Абмеркаванне на сходах супрацоўнікаў, улік прапаноў стэйкхолдараў |
| 2 | Зацвярджэнне Прыкладнага Статута УВА Канферэнцыяй рэктараў | Канферэнцыя рэктараў | 40–50 тыдні | |
| 3 | Прыняцце новых дэмакратычных Статутаў УВА на падставе рэкамендацый Прыкладнага Статута | Кіраўніцтва УВА, ГКР | 50–60 тыдні | У прыкладным Статуце рэкамендуецца дэмакратычная структура кіравання УВА, вызначаюцца паўнамоцтвы і кампетэнцыя створаных органаў, а таксама механізм іх фарміравання. Прапанаваныя ў названым дакуменце стандарты і тэрміналогія не патрабуюць абавязковага выкарыстання на ўзроўні УВА |
| 4 | Фарміраванне дэмакратычных органаў кіравання УВА, правядзенне выбараў у іх у адпаведнасці з патрабаваннямі абноўленых Статутаў | Кіраўніцтва УВА, ГКР | 60–65 тыдні | Уключаючы Саветы УВА, Саветы факультэтаў і інстытутаў, а таксама афіляваных з УВА арганізацый. |
| 5 | Правядзенне выбараў рэктараў УВА ў адпаведнасці ў новымі дэмакратычнымі Статутамі | НРВШ, ГКР, кіраўніцтва УВА | 65–72 тыдні | |
| 6 | Абмеркаванне са знешнімі і ўнутранымі стэйкхолдарамі на спецыяльна створаных дыскусійных пляцоўках пытанняў рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі, прадстаўленне асноўных вынікаў дыскусіі шырокай грамадскасці | Міністр адукацыі, НРВШ | 15–72 тыдні | Праз спецыяльныя рубрыкі на афіцыйных сайтах УВА і міністэрства, у іх акаўнтах у сацыяльных сетках, у сродках масавай інфармацыі. Абмеркаванне на сходах супрацоўнікаў, улік прапаноў стэйкхолдараў |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7 | Разгляд Канферэнцыяй рэктараў аналітычнай справаздачы аб прыярытэтах і напрамках рэформы вышэйшай адукацыі Беларусі. Падрыхтоўка Канферэнцыяй рэкамендацый для заканадаўцаў па канцэптуальных асновах будучай рэформы вышэйшай адукацыі | Канферэнцыя рэктараў | 60–72 тыдні | |
| 8 | Арганізацыя на факультэтах і падраздзяленнях УВА сустрэч з членамі працоўнай групы, прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі па пытаннях будучай рэформы вышэйшай адукацыі ў Беларусі | Кіраўніцтва УВА, ГКР, НРВШ | 15–72 тыдні | |
| 9 | Арганізацыя навучання супрацоўнікаў сістэмы адукацыі дэмакратычным працэдурам, механізмам і прынцыпам дзейнасці і ўзаемадзеяння ва ўмовах акадэмічнай свабоды вышэйшай адукацыі (з выкарыстаннем вопыту замежных універсітэтаў) | НРВШ, кіраўніцтва УВА | 15–72 тыдні | Правядзенне кароткіх практычных курсаў для выкладчыкаў УВА аб правах чалавека, этычных прынцыпах вышэйшай адукацыі, магчымасцях і рэсурсах акадэмічнай аўтаноміі УВА на падставе нацыянальнага і замежнага вопыту |
| 10 | Пашырэнне акадэмічнай мабільнасці, аднаўленне і развіццё міжнароднага супрацоўніцтва.<br>Распрацоўка і рэалізацыя Праграмы па прыцягненні ва УВА высокакваліфікаваных замежных спецыялістаў на выкладчыцкія і кіраўнічыя пасады | НРВШ, кіраўніцтва УВА, міністр адукацыі, МЗС | 15–72 тыдні | Пошук крыніц фінансавання згаданай праграмы як унутры краіны, так і за мяжой |
| 11 | Падрыхтоўка і публікацыя даклада НРВШ аб выніках выканання ДМ | НРВШ | 65–70 тыдні | Аналіз выканання мерапрыемстваў ДМ, фарміраванне высноў і рэкамендацый для Міністэрства адукацыі і УВА, у т.л. аб працягу выканання асобных мерапрыемстваў, спыненні дзейнасці часовых органаў і інш. |

Прадстаўлены праект “Дарожнай мапы дэмакратызацыі вышэйшай адукацыі Беларусі на перыяд 50–100–500 дзён” адкрыты для максімальна шырокага грамадскага і экспертнага абмеркавання, унясення абгрунтаваных дапаўненняў і змяненняў.

Рэалізацыя ДМ павінна ажыццяўляцца сумеснымі намаганнямі дэмакратычных палітычных сіл і беларускай супольнасці.

Імплементацыя ДМ будзе паспяховай пры ўмове сінхранізацыі яе мерапрыемстваў з іншымі дэмакратычнымі пераўтварэннямі ў адпаведнасці з агульнай “Стратэгіяй пераходу да Новай Беларусі”.

Як вынікае з ДМ, важнай перадумовай для яе паспяховай рэалізацыі з’яўляюцца таксама канкрэтныя крокі, якія могуць быць зробленыя да пачатку пераходнага перыяду. У сувязі з гэтым ДМ можа быць дапоўненая падрыхтоўчым этапам, які ўключае распрацоўку адпаведных дакументаў, што магло б стаць важнай задачай для экспертнай супольнасці сёння.